4. Мезенка, Г. М. Адантрапанімныя урбанонімы: праблемы матывацыі (на прыкладзе ўрбананімікона г. Барысава) / Г. М. Мезенка // Надзённыя праблемы лексікалогіі і анамастыкі славянскіх моў : матэрыялы II Міжнар. навук. канф., Мазыр, 22–23 крас. 2010 г. / Мазыр. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: В. В. Шур (адк. рэд.) [і інш.]. – Мазыр, 2010. – С. 16–18.

5. Мезенка, Г. М. Віцебшчына ў назвах вуліц: манаграфія : у 2 ч. / Г. М. Мезенка. – Віцебск : УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2008. – Ч. 1. – 363 с. – Ч. 2. – 254 с.

6. Мезенка, Г. М. Назвы ўнутрыгарадскіх аб'ектаў Шклова ў люстэрку беларускай урбананіміі / Г. М. Мезенка // Шклоўскія чытанні : матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канф., Шклоў, 1 верасня 2007 г. ; адк. рэд. А. А. Лукашанец. – Мінск, 2008. – С. 58–63.

7. Мезенка, Г. М. Намінацыя лінейных аб'ектаў на Пастаўшчыне: традыцыйнае і новае / Г. М. Мезенка // Пастаўскія чытанні – 2006 : матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канф., Паставы, 2 верасня 2006 г. / Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі ; адк. рэд. А. А. Лукашанец. – Мінск, 2008. – С. 38–49.

8. Мезенка, Г. М. Склад і асаблівасці функцыянавання геаграфічных апелятываў унутры- і калягарадскіх назваў Гродна / Г. М. Мезенка // Шануючы спадчыну Я. Карскага : Трэція навуковыя чытанні. – Гродна, 1992. – С. 49–52.

9. Мезенко, А. М. Мотивы номинации улиц белорусских городов / А. М. Мезенко // Топонимика и межнациональные отношения. – М., 1992. – С. 118–135.

10. Мезенко, А. М. Основные тенденции в динамике урбанонимов Гродно / А. М. Мезенко // Шануючы спадчыну Я. Карскага : Другія навуковыя чытанні. – Гродна, 1991. – С. 15–20.

11. Мезенко, А. М. Принципы наименования улиц Витебска и Ижевска / А. М. Мезенко // Пермистика: Вопросы диалектологии и истории пермских языков : сб. ст. – Ижевск, 1987. – С. 171–183.

12. Мезенко, А. М. Структура и географическое распространение урбонимов Белоруссии (простые урбонимы) / А. М. Мезенко // Русский язык : Межвед. сб. – Минск, 1990. – Вып. 10. – С. 26–36.

13. Мезенко, А. М. Структура и географическое распространение урбонимов Белоруссии (сложные урбонимы) / А. М. Мезенко // Русский язык : Межвед. сб. – Минск, 1992. – Вып. 11. – С. 26–36.

14. Мезенко, А. М. Урбанонимия Белоруссии / А. М. Мезенко. – Минск : Университетское, 1991. – 167 с.

15. Мезенко, А. М. Урбанонимия Несвижа в культурно-историческом аспекте / А. М. Мезенко // Слово во времени и пространстве : сб. науч. ст. – Минск, 1999. – С. 96–101.

**Н.Р. Тачыла**
Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна
e-mail: natakazak1980@mail.ru

УДК 811.161.1'373.2

## АДЭТНАНІМІЧНЫЯ НАЗВЫ (МІКРАТАПОНІМЫ, АНТРАПОНІМЫ) З АСНОВАЙ-ЭТНОНІМАМ "ЦЫГАН"

Ключавыя словы: *этнонім, мікратапонім, антрапонім, імя, этнас, цыган.*

*Артыкул прысвечаны апісанню адэтнанімічных утварэнняў (мікратапонімаў, антрапонімаў), якія маюць у сваім складзе этнонімы – назвы нацый, народаў, народнасцей, плямёнаў, племянных саюзаў, радоў і г.д., што сустракаюцца ў гаворках Беларусі.*



Репозиторий ВГУ

# ETNONYMNAMES (MICROTOPONYMS, ANTROPONYMS) WITH THE ETHNONYM BASIS OF «ROMA»

**N.G. Tochylo**
Mozyr State Pedagogical University namend after I.P. Shamyakin

Key words: *ethnonyms, anthroponyms, microtoponyms, drimonyms, agroonyms, oronyms.*

*The article deals with the units, which are derived from ethnonymic formation, such units contain ethnonyms – (names of nations, peoples, tribes, tribe units, kins), which are fixed in the Belarus dialects: anthroponyms, microtoponyms: drimonyms (names of forest tracts); agroonyms (the name of fields, land tenure); oronyms (the name of any forms of relief).*

Праблемай вывучэння этнонімаў і адэтнанімічных утварэнняў, пераважна айконімаў, тапонімаў, антрапонімаў, займаліся такія даследчыкі, як А. Рогалеў [9], Т. Аліферчык [1], І. Гурская [4]. Сярод вучоных, што даследавалі не як самамэту асаблівасці этнонімаў, мікратапонімаў, антрапонімаў у розных рэгіёнах Беларусі, можна адзначыць В. Жучкевіча [5; 6], Г. Іванову [7], І. Гапоненка [3], Н. Багамольнікаву [2], В. Лемцюгову [8], В. Шура [12] і інш. Аднак некаторыя этнонімы і адэтнанімічныя ўтварэнні разгледжаны фрагментарна і, на нашу думку, патрабуюць далейшага вывучэння. Намі зроблена спроба апісаць і прааналізаваць адзінкі, што маюць у сваім складзе этнонім *цыган,* вылучыць з іх групы паводле іх семантычнага складу, даць ім адпаведную лінгвістычную характарыстыку.

Пад адэтнанімічнымі ўтварэннямі мы разглядаем мікратапонімы і антрапонімы, што маюць у сваім складзе *этнонімы* – назвы народаў, нацый, народнасцей, плямёнаў, радоў і інш. *Мікратапонімы* – гэта клас геаграфічных назваў, якому ўласцівы свае асобныя рысы; назвы невялікіх аб’ектаў, на моўныя формы якіх уплываюць асаблівасці саміх рэалій. Гэта назвы археалагічных аб’ектаў – курганаў, магільнікаў, стаянак розных стагоддзяў, найменні палёў, урочышчаў, лясоў, вуліц, балот і інш., якія адлюстроўваюць памяць аб гістарычных з’явах, што адбываліся на тэрыторыі Беларусі і аставілі глыбокі след у калектыўнай памяці народа [9, 12]. *Антрапонім,* паводле А. Супяранскай – уласнае імя, якое можа мець чалавек або група людзей (асабовае імя, прозвішча, псеўданім, мянушка і г.д.) [11, 174].

На даследуемай тэрыторыі (пераважна Мазыршчына і Магілёўшчына) зафіксаваны ўласныя назвы, што маюць у сваім складзе лексему *цыган* (*цыганы* – гэта значная этнічная група на Беларусі, якая жыве на тэрыторыі нашай радзімы прыкладна з XV ст., а найбольш кампактна, цэлымі вуліцамі і пасёлкамі, у наш час цыганы жывуць у Віцебску, Бабруйску, Слуцку, Тураве, Калінкавічах, Пінску). Даследчыкі адзначаюць, што на Беларусі ёсць пяць вёсак, якія атрымалі назву ад этноніма цыганы (*Цыганы, Цыганкі, Цыганоўка*), размешчаны яны ў *Ляхавіцкім, Гарадоцкім, Сенненскім, Зельвенскім, Шаркаўшчынскім* раёнах, даволі частымі з’яўляюцца і мікратапонімы ад гэтага слова. У мясцовай мікратапаніміі лексема *цыган* звычайна ўказвае на аб'екты, дзе спыняліся цыганы, дзе стаялі іх шатры. Сярод адзначаных мікратапонімаў, утвораных ад этноніма *цыган,* выдзяляюцца наступныя групы*:* **дрымонімы** – *Цыганка* (в. Ляхаўцы Калін.), на думку мясцовых жыхароў, *“*раней тут была горка, пад якой у 1925 годзе стаялі цыганскія шатры, назва горкі пазней перайшла на назву лесу*”*, *Цыганская Градка* (в. Касцюковічы Маз.) – лес, у якім ёсць узвышанае месца працяглай формы, дзе звычайна спыняліся цыганы, *Цыганскія Пелі* (в. Ляхаўцы Калін.) – месца каля лесу, дзе стаялі шатры, а ў лесе былі пелі з вадой, *Цыганскі Островок* (в. Новая Рудня Ельск.) – месца ў лесе, дзе спыняліся цыганы, *Цыганская Парасля* (в. Скароднае Ельск.) – месца



Репозиторий ВГУ

ў лесе, дзе ў час Вялікай Айчыннай вайны звычайна ставілі свае шатры цыганы [7, 201]; *Цыганове* – лес, дзе стаялі цыганы (в. Чэрнеўка Шкл.), *Цыганскія Лясы* – месца, дзе жылі цыганы (в. Вышова Мсц.) [10, 192]; **аронімы** – *Цыганка* (в. Ляхаўцы Калін., в. М. Бакавец Маз.) – горка, пад якой, на думку мясцовых жыхароў, стаялі цыганскія шатры [7, 201], *Цыганскі Двор* – месца, дзе спыняліся цыганы (в. Умыркі Мсц.), *Цыганскі Луг* – частка лугу, якая належала цыгану (в. Маслакі Гор.), *Цыганскі Паруснік* – месца каля лесу, раней тут быў цыганскі табар (в. Леніна Красн.), *Цыганскія Горы* – узгоркі, дзе раней спыняліся цыганскія табары (в. Барсукі Бых.) [10, 192], *Цыганоўка* – урочышча, дзе спыняліся і пражывалі цыганы (Клімавічы), *Цыганскі Хутар* – урочышча, раней тут жылі цыганы (в. Колтава Мсц.) [10, 192]; **аграонімы** – *Цыганіха* (в. Скароднае Ельск.) – поле, каля якога пахавана цыганка [7, 201], *Цыганскі Пасёлак* – поле, дзе жылі цыганы (в. Вонічы Кліч.), *Цыганшчына* – поле, раней тут жылі цыганы (в. Затоны Гор.) [10, 192]. На тэрыторыі Беларусі зафіксаваны некаторыя антрапонімы, што маюць у сваім складзе этнонім *цыган* і маюць розныя суфіксальныя афармленні: ***Цыган*** Бр. *Ганц.;* Гом. *Петр., Раг., Светл.;* Мін. *Кап., Клец., Нясв.;* ***Цыганаў*** Віц. *Гар., Рас.*; Маг. *Слаўг.;* ***Цыганенка*** Бр. *Бар.*; Гр. *Ваўк.;* ***Цыганец*** Гр. *г. Гродна;* ***Цыганко*** Мін. *Барыс.;* ***Цыганкоў*** Бр. *Бяроз., Драг.*; Віц. *Арш., Брасл., Гар., Глыб., Дубр., Лёзн., Пол., Рас., Сен., Тал., Чашн., Шарк., Шум.*; Гом. *Б.-Каш., Ветк., Гом., Добр., Жытк., Карм., Светл.*; Гр. *Астр., Ашм., Зэльв.*; Маг. *Бабр., Бых., Бял., Гл., Гор., Касц., Кір., Клім., Кругл., Маг., Мсцісл., Слаўг., Хоц., Чав., Шкл.*; Мін. *Барыс., Бярэз., Мін., Нясв., Пух., Ст.дар., Чэрв.;* ***Цыгановіч*** Гом. *Лельч.;* Мін. *Пух.;* ***Цыганюк*** Бр. *Пін.;* Віц. *Пол.;* Гом. *Ветк., Гом., Маз.*; Маг. *Асіп.;* Мін. *Слуц., Ст.дар.;* ***Цыганоў*** Віц. *Рас.;* Гр. *Гродз., Зэльв.*; Маг. *Клім.*; Мін. *Барыс., Лаг.;* ***Цыганскі*** Бр. *Жаб.;* ***Цыганчук*** Бр. *Іван., Малар.;* Гом. *Добр.*

На даследуемай тэрыторыі метадам суцэльнай выбаркі з анамастычных і іншых слоўнікаў, з манаграфій вядомых даследчыкаў, кніг-хронік "*Памяць*" выяўлена мікратапонімаў і 11 антрапонімаў з асновай-этнонімам "*цыган*". У структурна-ўтваральных адносінах гэтыя адэтнанімічныя ўтварэнні можна падзяліць на некалькі груп. Намінацыі, што маюць у сваім складзе два кампаненты, з якіх першы атрыбутыўна-генетыўны суадносіцца са значэннем этноніма і ўказвае на прыналежнасць да якой-небудзь мясцовасці ці народа. Гэта мікратапонімы тыпу *Цыганскія Пелі, Цыганская Градка, Цыганскі Луг* і г.д. Група аднакампанентных намінацый уключае апелятывы, што адрозніваюцца па сваёй марфалагічнай структуры: аснова+розныя суфіксы (*Цыганове, Цыганоўка, Цыганіха, Цыганшчына, Цыганка* і г.д.). Сярод адэтнанімічных антрапонімаў, найбольш пашырана ўжыванне прозвішча *Цыганкоў,* якое вядома амаль што ва ўсіх частках Беларусі.

**Літаратура**


1. Аліферчык, Т. М. Тапанімія Заходняга Палесся ў этналінгвістычным аспекце : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук : 10.02.01 / Т. М. Аліферчык ; Інстытут мовы і літаратуры ім. Якуба Коласа і Янкі Купалы. – Мінск, 2011. – 20 с.
2. Багамольнікава, Н. А. Айканімія Гомельшчыны : слоўнік / Н. А. Багамольнікава, А. А. Станкевіч ; навук. рэд. В. П. Лемцюгова. – Гомель : УА "ГДУ імя Ф. Скарыны", 2003. – 392 с.
3. Гапоненка, І. А. Лексіка беларуская літаратурнай мовы XIX – пачатку XX ст.: асаблівасці станаўлення і развіцця / І. А. Гапоненка. – Мінск : БДУ, 2012. – 307 с.
4. Гурская, Ю. А. Фамилии отэтнонимического происхождения на территории Великого Княжества Литовского / Ю. А. Гуртская // Вестн. КГУ им. Н. А. Некрасова. – № 3. – 2010. – С. 160–165.
5. Жучкевіч, В. А. Макратапанімія, агульныя заканамернасці, яе ўзнікненне і функцыяніраванне / В. А. Жучкевіч : Беларуская анамастыка, 26 / Зборнік ; рэд. В. П. Лемцюгова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – С. 46–73.




Репозиторий ВГУ

6. Жучкевич, В. А. Краткий топонимический словарь Белоруссии / В. А. Жучкевич. – Минск : Изд-во БГУ, 1974. – 447 с.
7. Иванова, А. А. Микротопонимия Мозырского Полесья / А. А. Иванова. – Мозырь : УО «МГПУ», 2003. – 219 с.
8. Лемцюгова, В. П. Тапонімы распавядаюць: навукова-папулярныя эцюды / В. П. Лемцюгова. – Мінск : Литература и Исскуство, 2008. – 416 с.
9. Рогалев, А. Ф. Этнические и географические названия как источник для изучения этноязыковой истории (на материале Беларуси) : автореф. дис. … д-ра филол. наук : 10.02.19 / А.Ф. Рогалев ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 1996. – С. 13.
10. Слоўнік мікратапонімаў Магілёўшчыны / склад. С. В. Клімуць [і інш.]. – Магілёў : МДУ імя А. Куляшова, 2004. – 208 с.
11. Суперанская, А. В. Общая теория имени собственного / А. В. Суперанская. – М. : Наука, 1973. – 367 с.
12. Шур, В. В Уласнае імя ў соцыуме і мастацкім тэксце : манаграфія / В. В. Шур. – Мазыр : МДПУ імя І. П. Шамякіна, 2015. – 299 с.

**М.Г. Цинкобурова**
Санкт-Петербургский горный университет
e-mail: maschek@mail.ru

УДК 83’373.211.1(470.23)

## СТРАТИГРАФИЧЕСКИЕ ОСОБЕННОСТИ ТОПОНИМОВ ЗАПАДНОЙ ПОЛОВИНЫ ЛЕНИНГРАДСКОЙ ОБЛАСТИ

Ключевые слова: *стратиграфия топонимов, Водская пятина, топонимы Ленинградской области, трансформированные топонимы.*

*Западная половина Ленинградской области на протяжении длительного времени относилась к Шелонской и Водской пятинам и являлась областью смешанного проживания финно-угорского и славянского населения. В результате этого для района, как и для всего северо-запада России, характерно многовековое взаимодействие и сосуществование разноязычных топонимических систем. В диахроническом аспекте в регионе можно выделить дорусский (субстратный), древнерусский и русский пласты топонимии.*

**M. Tsinkoburova**
Saint-Petersburg Mining University

## STRATIGRAPHIC FEATURES OF TOPONYMS OF THE WEST PART OF LENINGRAD REGION

Key-words: *toponym's stratigraphy, Vodskaya Pyatina, place names of Leningrad region, transformed toponyms.*

*The west part of Leningrad region during the long time was on the territory of Vodskaya and Shelonskaya Pyatina and was the area of joint habitation of Finno-Ugric and Russian population. In result, there is typical centuries-old cooperation and co-existence of different multilingual toponymic systems for this region as for all north-west of Russia. It is possible to establish pre-Russian (substrate), Old-Russian and Russian toponyms layers in diachronic aspect.*

Репозиторий ВГУ